# НА АБЛАСНОЙ ДОШЦЫ ГОНАРУ – ВДУ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА

**Трэцяе ліпеня запомніўся Машэраўцам не толькі ўдзелам ва ўрачыстым парадзе, прысвечаным галоўнаму дзяржаўнаму святу – Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, але і цырымоніяй уручэння пасведчанняў аб занясенні на Віцебскую абласную Дошку гонару. Пачэснае месца сярод іншых пераможцаў спаборніцтва за лепшыя дасягненні ў 2023 годзе заняў ВДУ імя П.М. Машэрава (сярод арганізацый, што ажыццяўляюць дзейнасць у сферы адукацыі).**

Ва ўрачыстай цырымоніі прынялі ўдзел старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Суббоцін, старшыня абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый Дзямідаў, памочнік Прэзідэнта – інспектар па Віцебскай вобласці Сяргей Ляўковіч, кіраўніцтва горада, дэпутаты, кіраўнікі раённых адміністрацый Віцебска, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і прадпрыемстваў.

Аляксандр Суббоцін звярнуўся да прысутных і адзначыў, што ў сацыяльна-эканамічным развіцці Віцебская вобласць завяршыла



мінулы год з ростам па ўсіх паказчыках, а таксама падкрэсліў, што гэта вельмі сімвалічна – праводзіць цырымонію ўшанавання пераможцаў у важны для кожнага беларуса дзень – Дзень Незалежнасці нашай краіны.

Аляксандр Міхайлавіч асабіста ўручыў пасведчанні аб занясенні на Дошку гонару Віцебскай вобласці прадстаўнікам арганізацый і прадпрыемстваў.

Ад імя ВДУ імя П.М. Машэрава яго атрымаў першы прарэктар Андрэй Мехавіч, кандыдат фізіка-матэматычных навук.